# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны*

УДК 94(4)"1914/19"+94(476)"1914/19"

*М. А. БЯСПАЛАЯ*

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА: ДРАМАТЫЧНЫ ЛЁС БЕЛАРУСІ[1]

*Праз стаўленне розных груп насельніцтва беларускіх губерняў да Першай сусветнай вайны ў артыкуле разглядаюцца яе галоўныя падзеі: мабілізацыя, баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, трагедыя бежанцаў, рост антываенных настрояў, палітыка акупацыйных улад і інш.*



Тэма Першай сусветнай вайны для навукоўцаў доўгі час заставалася на другім плане: бытаваў савецкі стэрэатып аб гэтай вайне як імперыялістычнай, на франтах якой змагаліся быццам бы нейкія іншыя людзі, а не нашы продкі. Вучэбныя планы па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі прадугледжвалі вывучэнне гэтай тэмы, але ў падручніках вайна называлася папярэдніцай Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. Тым не менш беларусы захавалі памяць аб трагедыі Першай сусветнай вайны і не толькі на ўзроўні сям'і. Некаторыя нашы суайчыннікі мэтанакіравана збіралі матэрыялы аб гэтай вайне. Цікавы прыклад – дзейнасць вядомага беларускага мастака Б. Б. Цітовіча і яго сям'і. Дзякуючы ім створаны своеасаблівы мемарыяльны музей пад адкрытым небам на Вілейшчыне на месцы баёў 1915–1916 гг.

У айчыннай гістарыяграфіі доўгі час заставалася адзінай кандыдацкая дысертацыя А. М. Бабкова, абароненая ў 1983 г., на тэму «Палітыка германскага імперыялізму ў Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны». Цікавасць да Першай сусветнай узнікла ў навуковым асяроддзі ў сувязі з 90-годдзем пачатку вайны. Былі праведзены навуковыя канферэнцыі, апублікаваны

[1] Выкарыстаны фотаздымкі з кнігі В. М. Бялявінай «Беларусь в годы Первой мировой войны».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зборнікі дакладаў, навуковыя артыкулы. У апошнія 10 гадоў было абаронена некалькі дысертацый, якія асвятлялі асобныя аспекты вайны. Адно з найбольш цікавых выданняў гэтага перыяду – кніга В. М. Бялявінай «Беларусь в годы Первой мировой войны» [3], багата ілюстраваная дакументальнымі фотаздымкамі. Цікавыя звесткі аб сітуацыі ў беларускіх гарадах і вёсках падчас вайны можна знайсці ў мемуарах В. Бембель-Дзядок, Э. Вайніловіча, І. Голубева.

Аб прычынах развязвання вайны шырока вядома, таму спыняцца на гэтым пытанні не мае сэнсу. Большую цікавасць выклікае тое, як весткі аб пачатку вайны ўспрынялі розныя колы грамадства. Адносіны да аб'яўлення мабілізацыі, а потым і да вайны вагаліся ад выразна шавіністычных і ўрапатрыятычных да рэвалюцыйна-паражэнчых. У першыя тыдні вайны ва ўсіх краінах, уцягнутых у яе, пераважала першая катэгорыя настрояў. Дакументы адлюстроўваюць упэўненасць у хуткай перамозе ў немцаў і французаў, англічан і аўстрыйцаў і, безумоўна, расіян. На падтрыманне гэтай упэўненасці былі накіраваны ўсе сродкі тагачаснай прапаганды. Паўсюдна дэманстравалася адзінства народа і ўрада.

У якасці ілюстрацыі да сказанага вышэй выкарыстаем апісанне сустрэчы Мікалая II у Маскве 18 жніўня 1914 г., якое пакінула графіня П. С. Уварава: «…яго Вялікасць Гасудар Імператар, па заведзеным звычаі, наведаў Маскву для аб'яўлення адкрыцця ваенных дзеянняў супраць Германіі. … Натоўпы народу запрудзілі плошчу перад Мікалаеўскім вакзалам, сустрэлі царственных гасцей моцным "ура" з гімнам і суправаджалі іх Вялікасці … да Іверскай капліцы і ў самым Крамлі, дзе натоўпы народу прастаялі да позняй ночы, праводзячы яго Вялікасць і тады, калі ён паехаў у Дваранскі сход, дзе быў урачыста прыняты дваранствам і іншымі саслоўямі, дзе яго Вялікасці быў паднесены сцяг з выявай Святога Георгія Перамаганосца…»[2] [16, с 192].

Патрыятычныя шэсці і малебны адбыліся і ў гарадах Беларусі. Па ўспамінах грамадскага дзеяча Э. А. Вайніловіча, «… на дзіва дружна нацыянальныя пачуцці аб'ядналі грамадства супраць Германіі… У славянскіх сэрцах абудзіліся варожыя пачуцці супраць Германіі, якія існавалі з самага пачатку гісторыі, пачуцці шчырыя, не ведаючыя паблажкі…» [5, с. 222]. Патрыятычны ўздым ахапіў і многіх землеўласнікаў беларусіх губерняў, якія, нягледзячы на негатыўнае стаўленне да царскіх улад, частае непаразуменне з імі, аднагалосна падпісалі адрас на імя імператара. У ім утрымліваліся спасылкі на падзеі Грунвальдскай бітвы, «перамога ў якой дасягнута аб'яднанымі польска-літоўска-рускімі войскамі і якая спыніла хвалю германізацыі … і дала магчымасць славянскім народам развівацца самастойна. І сёння гэтыя народы таксама маюць права спадзявацца на падобнае развіццё падзей з дазволу Яго Светласці пасля перамогі над ворагам» [5, с. 221]. У адказе імператара пацвярджаліся гэтыя спадзяванні.

На хвалі ўсеагульнага патрыятызму антываенныя настроі не адчуваліся. Нават левыя партыі ў Германіі і Францыі і іх дэпутаты ў парламентах спачатку падтрымлівалі вайну і галасавалі за выдзяленне ваенных крэдытаў. Толькі РСДРП(б) адразу заняла бескампрамісную пазіцыю і, аб'явіўшы вайну імперыялістычнай, заклікала да ператварэння яе ў грамадзянскую. Аб'ектыўны ход падзей на працягу вайны ў 1914–1918 гг. прывёў да

[2] Цытаты прыводзяцца ў перакладзе аўтара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяўлення праграмы бальшавікоў, якія здолелі ператварыць стыхійныя імкненні народу да міру ў зразумелыя ўсім заклікі.

Якую ж пазіцыю занялі тыя, з каго складалася расійскае войска, – сяляне? Даследчыкі сцвярджаюць, што дзве мабілізацыі ў ліпені 1914 г. прайшлі паспяхова, на прызыўныя пункты з'явілася 96 % запасных і ратнікаў. Разам з тым, падкрэсліваецца, што сярод сялян не назіралася патрэбнага ўладам патрыятычнага ўздыму. Патрыятызм вяскоўцаў праяўляўся патрыярхальна, на ўзроўні веры ў Бога і бязгрэшнасць Цара, а не на ўсведамленні неабходнасці адстойваць інтарэсы сваёй краіны. Гэты прымітыўны патрыятызм у пэўнай ступені тлумачыцца тым, што 61 % прызыўнікоў былі непісьменнымі. У той час, як у Германіі гэты паказчык быў 0,04 %, Англіі – 1 % і г. д. [6, с. 18]. Разам з тым сяляне разумелі, што вайна пагражае разбурэннем гаспадаркі і сям'і, таму асноўная маса вяскоўцаў «успрымала вайну насцярожана, чакаючы ад яе новых цяжкасцей, а таксама трывог за лёс сваякоў, якія накіроўваліся на фронт. З гэтай прычыны большасць насельніцтва жадала заканчэння вайны як мага хутчэй» [5, с. 16]. Да гэтага можна дадаць, што пераважная частка насельніцтва імперыі і салдат не разумелі мэты вайны. Узгадаем надзвычай выразную характарыстыку сітуацыі з успамінаў вядомага военачальніка А. А. Брусілава. Ён пісаў, што больш-менш ведалі аб тым, што «нейкі там эрц-герц-перц з жонкаю былі кімсьці забітыя, і таму аўстрыякі хацелі пакрыўдзіць сербаў. Аднак хто ж такія сербы – не ведаў амаль ніхто, хто такія славяне – было гэтак жа цёмна, а чаму немцы з-за Сербіі ўздумалі ваяваць – было зусім невядома» [4, с. 70].

У такіх сацыякультурных і сацыяпсіхалагічных умовах 1 жніўня 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна. Яшчэ да яе пачатку, 18 ліпеня 1914 г. у Мінскай губерні было аб'яўлена ваеннае становішча. Зноў спашлёмся на ўспаміны Э. А. Вайніловіча: «Мне добра запомнілася дата 18 ліпеня 1914 г. У тую ноч мяне разбудзілі і ўручылі канверт з чырвонай абвесткай. У абвестцы прадпісвалася з'явіцца ў павятовы Слуцк для выканання абавязкаў старшыні мабілізацыйнай камісіі… Уборка ўраджаю была перапынена, людзей мабілізавалі, а вазы, збруя, коні – усё адразу з палёў пайшло ў павет. Горад набыў выгляд ваеннага лагера, запоўніўся натоўпамі сялян, якія праводзілі сваіх мужой і сыноў з плачам і галашэннямі, а яшчэ больш аплаквалі рэквізаваную маёмасць…» [5, с. 218–219].

На тэрыторыі Беларусі былі створаны дзве ваенныя акругі – Мінская і Дзвінская, за гады вайны з іх мабілізавалі прыкладна 800–900 тыс. чалавек, што складала амаль 51 % ад усёй колькасці дарослых мужчын [17, с. 31]. Падчас прызыўных кампаній нярэдкімі былі стыхійныя бунты навабранцаў, якія праяўляліся ў рабаванні памешчыцкіх маёнткаў, сядзіб заможных сялян, вінных і харчовых крамаў і складоў.

З пачатку вайны да жніўня 1915 г. тэрыторыя Беларусі з'яўлялася прыфрантавой. У першыя месяцы вайны жыццё працякала спакойна. Напрыклад, нягледзячы на тое, што Мінская губерня знаходзілася на ваенным становішчы, у газетах г. Пінска абмяркоўваліся пытанні аб магчымасці перамяшчэння ў Пінск тэкстыльнай прамысловасці з Польшчы, па прапанове віцебскіх прадпрымальнікаў даць ім канцэсіі на ўладкаванне ў Пінску электрычнага асвятлення і г. д. [13, с. 57].

Аднак ужо летам 1915 г. на тэрыторыі Беларусі пачынаюцца жорсткія баі з выкарыстаннем усіх родаў войск. Напрыклад, каб вывесці са строю

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

рускую авіяцыю, нямецкія войскі на працягу двух тыдняў бамбардзіравалі Брэсцкую крэпасць, дзе знаходзілася паветраплавальная рота [9, с. 220]. За перыяд баёў горад ператварыўся ў руіны. Дакладнымі з’яўляюцца факты артылерыйскіх абстрэлаў і бамбёжак бежанцаў. Дакументы сведчаць, што ў раёне Пінска нямецкая артылерыя абстрэльвала снарадамі з удушлівымі газамі бежанцаў, было выпушчана каля сотні снарадаў [13, с. 117].



Пасля стабілізацыі лініі фронту немцы працягвалі бамбіць прылеглыя тэрыторыі. Аб гэтым у адным з пісем паведамляў Аляксандр Блок, які служыў у раёне Лунінца: «…раніцай і вечарам нас наведвае аэраплан, які скідвае бомбы галоўным чынам на мост у Парахонску і на станцыю Лунінец, дзе 90 пуцей…» [11, с. 509]. Аўтар аднаго франтавога пісьма, служачы ваеннага шпіталя, паведамляў сябру: «Калі былі ў Аўстрыі, там не было так небяспечна, там, калі бралі ў палон каго-небудзь з Чырвонага Крыжа, то выпускалі, у Чырвоны Крыж не стралялі. Але гэтыя немцы паляць па Чырвоным Крыжы, як па астатніх войсках, калі бяруць у палон – не выпускаюць…» [8, л. 197 зв.].

У кастрычніку 1915 г. пасля ўпартых і кровапралітных баёў фронт стабілізаваўся на тэрыторыі Беларусі па лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск. Паміж варожымі бакамі пачалі складвацца неадназначныя адносіны. А. І. Дзянікін успамінаў: «… па Прыпяці і прытоках яе, і каналах здаўна ўстанавілася нават нейкае паўмірнае суіснаванне з немцамі, з развіццём узаемавыгаднага для “товарищей” тайнага тавараабароту. Паступалі, напрыклад, данясенні, што ў Пінск на базар штодзённа з’яўляюцца з пазіцый рускія салдаты-мяшочнікі, і іх з’яўленне па розных прычынах заахвочваецца нямецкімі ўладамі» [13, с. 211].

Аптымістычны настрой першых месяцаў вайны рэзка змяніўся пасля паражэння і адступлення расійскіх войск у 1915 г., якое суправаджалася такой сацыяльна-эканамічнай і псіхалагічнай катастрофай, як бежанства. Адкуль яго вытокі? Адказ на гэта пытанне не можа быць адназначным. Нельга сцвярджаць, што людзі свядома ўцякалі ад жахаў вайны, была і яшчэ адна прычына – дзяржаўная ідэалогія. Справа ў тым, што Мікалай ІІ назваў вайну «Другой Айчыннай вайной», а тагачасная прэса падхапіла гэту ідэю. Вышэйшае ваеннае камандаванне, асабліва ў акружэнні Галоўна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, прымяняла тактыку «выпаленай зямлі», калі праціўніку пакідалі пустую тэрыторыю – без людзей, без правіянту, без фуражу. І ў многіх месцах, што пацвярджаюць дакументы і ўспаміны, ваенныя ініцыіравалі ўцёкі насельніцтва разам з адступаючай арміяй. Праваслаўныя святары таксама заклікалі да ўцёкаў і самі паказвалі прыклад, першымі пакідаючы небяспечныя раёны. Бежанцы рухаліся па палях, сеючы навокал страх і спусташэнне. Э. А. Вайніловіч успамінаў: «У нашых ваколіцах шкода, якую яны нанеслі, была больш адчувальнай у параўнанні з той, якую зрабіла войска. Салдаты былі суровыя, але стараліся без неабходнасці нічога не чапаць, у той час як бежанцы, топчучы нязжатыя палі і зларадна знішчаючы ўсё, што пападалася пад руку, заяўлялі: “Мы не столькі згубілі”. Двары і фальваркі з жахам сустракалі вялізныя абозы…, якія хаатычна рухаючыся на ўсход, спыняліся там, дзе яшчэ можна было што-небудзь знайсці і, як саранча, пакідалі пасля сябе пустыню... Праўда, лёс гэтых няшчасных бежанцаў быў нялёгкім… яны пакутавалі ад холаду і слоты. Пачаліся інфекцыйныя хваробы, нават халера, пагрозу якой хутка ліквідавалі, хутчэй па волі Бога, а не ў выніку прынятых урадам мер… Пасля мабілізацыі дзяржаўных і грамадскіх сіл урад стараўся ні ў чым не адказваць пацярпелым ад вайны: бежанцы мелі ўсё, нават болей, чым мясцовае насельніцтва. Яны, атрымаўшы свой паёк у адным месцы, шлі ў другое, а потым трэцяе, пры гэтым яны фіктыўна павялічвалі колькасць членаў сваіх сем’яў... Мелі месца выпадкі, калі бежанцы прадавалі лішкі харчавання мясцоваму насельніцтву і кармілі імі свіней» [5, с. 227–229].

Па афіцыйных даных, колькасць бежанцаў з заходніх губерняў Беларусі склала 1 130 042 чалавекі. Значная колькасць, напрыклад 123 900 чалавек аселі ў Мінскай губерні, больш за 50 тыс. – у Віцебскай, каля 10 тыс. – у Магілёўскай [1, с. 147]. Астатнія былі расселены ў другіх губернях імперыі.



Землеўласнікі Міншчыны з трывогай назіралі за гэтымі падзеямі, аднак усё ж такі не паддаліся агульнай ліхаманцы, а вырашылі застацца на месцах, насуперак ціску з боку адступаючых расійскіх войск. «Калі гінуць, то лепш пад сваім плотам, чым пад чужым», – разважалі яны. Па сведчанні Э. А. Вайніловіча, сяляне, даведаўшыся, што двор нікуды не збіраецца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачалі апрацоўваць палі. Такім чынам, «маёнткі выканалі сваю місію – насельніцтва не паддалося на эміграцыйную паніку» [5, с. 229].

У час Першай сусветнай вайны рэзка пагоршылася эканамічная сітуацыя. Насельніцтва прыфрантавой паласы прыцягвалі на ваенна-прымусовыя работы, праводзілася маштабная рэквізіцыя. Напрыклад, у студзені 1915 г. па Віцебскай губерні загадвалася рэквізаваць 40 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, у лютым 1915 г. па Мінскай губерні рэквізавана 18 тыс. галоў, у красавіку 1915 г. у Лепельскім павеце былі забраны ўсе запасы кармоў. Нельга сказаць, што рэквізіцыі адбываліся мірным шляхам. Архіўныя дакументы, на якія спасылаюцца навукоўцы, апісваюць факты ўзнікнення неарганізаваных антываенных выступленняў: супраціўленне набору на ваенныя работы і рэквізіцыі, непавага словам імператара Мікалая ІІ, укрывальніцтва дэзерціраў, падробка дакументаў, самастрэлы і г. д.

Рэзка ўзраслі цэны на прадукты харчавання. Напрыклад, у неакупіраваных паветах Мінскай губерні напрыканцы 1915 г. бульба каштавала ў 2 разы даражэй, масла – на 71 %, жытнёвы хлеб – на 33 %, сала – на 25 %, соль – на 25,2 % даражэй, чым да вайны. Інспектар Мінскай губерні паведамляў у Міністэрства гандлю і прамысловасці: «Цяпер жыць у Мінску, асабліва сямейным, становіцца амаль немагчымым. У сувязі з тым, што адсутнічае падвоз і горад перапоўнены войскамі, якія падчышчаюць запасы правізіі, што яшчэ захаваліся ў насельніцтва, цэны на харчаванне значна падняліся. Ні чорнага, ні белага хлеба ў горадзе купіць немагчыма, нават у рэстаранах, у тым ліку і першакласных, хлеб падаецца на абед не кожны дзень, цукар даўно не прадаецца. Няма свечак, газы» [18, с. 411].

Сучаснікі ў даволі рэзкіх выразах аднадушна апавядаюць пра росквіт бюракратыі. Напрыклад, Э. А. Вайніловіч піша: «У вачах мітусіла ад такіх арганізацый, як “Усерасійскі земскі саюз”, “Саюз гарадоў”, “Чырвоны Крыж”, якія не заўсёды мелі хворых ці людзей, якім патрэбна была апека, затое мелі добра адкормленых і паўнагрудых “сястрычак” і мноства чыноўнікаў. Шматлікія аддзелы таварыстваў: “Цэнтральны грамадзянскі камітэт” і “Польскае таварыства дапамогі ахвярам вайны” былі перапоўнены высокааплатнымі кіраўнікамі, іх намеснікамі, інструктарамі, памочнікамі і г. д. Усе гэтыя шматлікія функцыянеры спарадзілі разбэшчаную бюракратыю...» [5, с. 229].

Пасля стабілізацыі фронту восенню 1915 г. частка паветаў Мінскай губерні апынулася пад нямецкай акупацыяй, а астатнія – у прыфрантавой паласе. Чалавек паступова прызвычайваецца да ўсяго, нават да пастаяннага руху ваенных абозаў, перадыслакацыі ваенных атрадаў, варожых налётаў. Самалёты спачатку выклікалі трывогу, а потым перасталі пужаць людзей, якія нават не глядзелі на іх і не адрываліся ад палявых работ. І. Голубеў сведчыць: «Германскія самалёты прыляталі дастаткова часта, 20 сакавіка 1916 г. у гадзіну ночы прыляцеў нямецкі цэпелін і кінуў некалькі бомб, аднак шкоды не нарабіў, толькі моцна напужаў жыхароў. 23 сакавіка 1916 г. прыляцеў нямецкі аэраплан, але шкоды не зрабіў. 21 чэрвеня 1916 г. каля 4 гадзін раніцы прыляцелі 2 нямецкія аэрапланы і да 6 гадзін раніцы круціліся над горадам, кінулі некалькі бомб і дзе-нідзе зрабілі пашкоджанні і паранілі людзей, але больш за ўсё ўсхвалявалі» [15, с. 122].

Нагадаем, што занятая кайзераўскімі войскамі ў 1915 г. тэрыторыя Беларусі атрымала назву «Вобласць вышэйшага камандавання на Усходзе», ці скарочана «Обер-Ост». Гэта было мілітарысцкае ўтварэнне, дзе ваеннае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камандаванне кантралявала ўсё эканамічнае жыццё: гандаль, сельскагаспадарчую вытворчасць, лясную гаспадарку. Была арганізавана акупацыйная грашовая сістэма, якая суадносілася з грашовай сістэмай Германіі. На думку даследчыкаў, у кіраўніцтва «Обер-Ост» пераважала ідэя панавання праз ажыццяўленне кантролю над гаспадарчымі і грамадскімі сферамі. Выспявала думка аб стварэнні калоній на Усходзе, пашыралася жаданне мець тут маёнткі. У адной з адозваў гаварылася: «Каланізацыя зямлі на Усходзе для нас з'яўляецца жыццёва неабходнай. Толькі там мы можам даць зямлю нашым салдатам і сынам. Два мільёны нямецкіх гаспадароў чакаюць зямель у Расіі» [10, с. 95].

Сярод ваеннай эліты і кіраўніцтва «Обер-Ост» узніклі надзеі на пашырэнне «нямецкага парадку» на ўсход, але ўяўленне аб мясцовым насельніцтве як аб «ніжэйшай расе» пакуль адсутнічала. Як правіла, нямецкія салдаты ў Першую сусветную вайну не мелі ніякага ўяўлення аб народах Расійскай імперыі. Узровень культурнага развіцця мясцовага насельніцтва ацэньвалі як нізкі, адсталы. «Культурныя перадавікі», па выказванні Б. К'яры, разглядалі праявы культурнасці на акупіраванай тэрыторыі перш за ўсё як вынік уплыву нямецкіх салдат і афіцэраў, а іх разуменне вайны не ішло далей за «ўяўленне аб пераможнай вайне сыноў Германіі супраць цёмных абарыгенаў на Усходзе», якія разглядаліся як насельніцтва новых германскіх калоній, але пакуль яшчэ не лічыліся ніжэйшай расай [20, с. 139].

Адзначым прыкметную ролю нямецкіх вучоных-славістаў у пашырэнні сярод салдат аб'ектыўных поглядаў на гісторыю і культуру мясцовага насельніцтва. Найбольш актыўна культурна-асветную работу сярод акупацыйных войскаў праводзіў вядомы славіст, мастацтвазнаўца А. Іпель, стараннямі якога былі арганізаваны дзве выставы беларускага мастацтва і апублікаваны шэраг артыкулаў. Вядомы славіст з Вроцлава Р. Абіхт друкаваў артыкулы аб гісторыі беларускага народа, яго духоўнай культуры, перакладаў творы Я. Купалы, Я. Коласа, беларускія песні і казкі. Не аднойчы выступаў перад кайзераўскімі ваеннымі з лекцыямі афіцэр культурнага аддзела «Обер-Ост» Ф. Куршман – вядомы вучоны-славіст з Берлінскага ўніверсітэта. Публіцыст В. Егер апублікаваў кнігу «Беларусь», у якой разглядаліся пытанні гісторыі, гаспадарчага развіцця, духоўнай культуры і г. д. [14, с. 15].

Некаторыя крыніцы ўказваюць на стварэнне своеасаблівых рэзервацый і лагераў для мясцовага насельніцтва і бежанцаў, напрыклад у Брэсце [9, с. 219], а таксама аб тым, што ўжо з 1916 г. акупанты пачалі сілай застаўляць жыхароў, асабліва маладых, ехаць на работу ў Германію, таму што там адчуваўся недахоп рабочай сілы. У выніку гвалтоўнай адпраўкі людзей у Германію, масавых хвароб значна знізілася колькасць насельніцтва ў вёсках і гарадах [2, с. 13–14].

Спецыялізаваныя ваенізаваныя каманды кантралявалі збор шматлікіх падаткаў: падушнага, пазямельнага, гандлёвага і г. д. Аб тым, як адбывалася ўсталяванне акупацыйнай улады на месцах, успамінаў Э. А. Вайніловіч: «...Прыехала некалькі кавалерыстаў у разгар гандлю на рынак, запоўнены шматлікімі вазамі з навакольных вёсак. Афіцэр і некалькі радавых салдат увайшлі ў ратушу і аб'явілі, што з гэтага моманту ўлада пераходзіць у іх рукі, і ўжо з гэтага моманту яны пачалі "адмяраць справядлівасць", выдаваць законы, разлічвацца маркамі і пфенінгамі, а таксама прызначаць падаткі» [5, с. 251].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шматлікія загады, распараджэнні рэгламентавалі жыццё насельніцтва акупіраванай тэрыторыі: без дазволу забаранялася ездзіць з аднаго паселішча ў іншае, нават у царкву, прадаваць мяса і прадукты новага ўраджаю, паляванне і рыбная лоўля без спецыяльнага дазволу таксама забараняліся. За парушэнне каралі штрафамі, турэмным зняволеннем, а то і смерцю. Напрыклад, за продаж прадуктаў новага ўраджаю можна было атрымаць штраф у 6 тыс. марак ці 6 месяцаў турмы [10, с. 95]. Матэрыяльныя каштоўнасці вывозілі ў Германію, як, напрыклад, абсталяванне суконнай фабрыкі Скірмунтаў з Парэчча. Вывозілі санітарныя павозкі, шпалы, метал, вырабы са шкла, тэлеграфныя слупы, абсталяванне тыпаграфій, электрастанцый і г. д. [12, с. 336–337].

Актыўна эксплуатаваліся лясныя багацці. З 1915 г. у Белавежскай пушчы было пабудавана 7 лесапільных і адзін шпалапрапітачны завод і пракладзена пад'язная чыгунка [2, с. 13]. За кароткі тэрмін нямецкія акупацыйныя ўлады «разрабавалі і вывезлі амаль усе харчовыя запасы. У іх рукі трапілі харчовыя склады, з вёскі забралі ўсё, што маглі, падлічылі ўсе астаткі харчавання без гарантыі таго, што будуць карміць гарадское насельніцтва» [12, с. 387].



Акупантам было вельмі важна наладзіць сельскагаспадарчыя работы, каб не дапусціць незасеяных палёў. З гэтай мэтай да кожнай буйной гаспадаркі прыкамандзіравалася ад 10 да 30 салдат германскай арміі, якія выконвалі функцыі і паліцыі, і юстыцыі. Акрамя гэтага акупанты экспрапрыіравалі маёнткі, уладальнікі якіх выехалі ў Расію. На пачатак 1918 г. з 704 500 га прыдатных для сельскагаспадарчых работ зямель 87 500 га кантралявалі нямецкія ўлады [2, с. 13]. Такімі мерамі яны спадзяваліся аблегчыць харчовы крызіс, а разам з гэтым знізіць унутрыпалітычную напружанасць у самой Германіі.

Нельга не адзначыць, што на акупіраванай немцамі тэрыторыі расійскае камандаванне імкнулася разгарнуць партызанскі рух па прыкладзе вайны 1812 г. Арганізацыя партызанскіх атрадаў пачалася з верасня 1915 г., і за тры месяцы на Заходнім фронце было створана 11 партызанскіх атрадаў [19, с. 9]. Аднак у 1916 г. армейскі партызанскі рух пачаў згортвацца з-за малой эфектыўнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нямецкае камандаванне таксама стварае тайныя арганізацыі для разлажэння расійскай арміі. Напрыклад, вясной 1915 г. у асяроддзі медыцынскіх работнікаў быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны саюз, які вёў антываенную агітацыю, рэгулярна рабіў справаздачы перад германскім штабам, аднак быў ліквідаваны рускай контрразведкай зімой 1916 г. [6, с. 18]. На перадавой рэгулярна распаўсюджваліся антыўрадавыя і антываенныя лістоўкі, якія заклікалі расійскіх салдат здавацца ў палон і г. д.

Памеры артыкула не дазваляюць хаця б бегла разгледзець ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, напрыклад Нарачанскую аперацыю рускай арміі ў сакавіку 1916 г. Пасля яе правалу спецыяльная камісія прыйшла да высновы, што ў гібелі амаль 80 тыс. салдат і афіцэраў вінавата камандаванне і «чым вышэй, тым больш», а дзеянні тых, хто хадзіў у атакі, «бездакорны і заслугоўваюць глыбокай павагі» [7, с. 333]. Такая ж трагедыя адбылася з расійскімі войскамі пад Баранавічамі ў чэрвені-ліпені 1916 г., дзе было яшчэ больш загінуўшых. Ваенныя няўдачы, велізарныя людскія страты, стомленасць ад вайны і іншыя прычыны прывялі да ўзрастання антываенных настрояў у арміі. Салдаты добраахвотна здаваліся ў палон, адмаўляліся ад выхаду на пазіцыі, браталіся, дэзерціравалі. Напрыклад, з ліпеня 1914 г. па люты 1917 г. з арміі Заходняга фронту і з 5-й арміі Паўночнага фронту, якая дыслацыравалася на Віцебшчыне, дэзерціравала больш за 20 тыс. чалавек [6, с. 15].

Такім чынам, Першая сусветная вайна аказалася пераломнай падзеяй у эканамічным, палітычным, сацыякультурным развіцці Расійскай імперыі, у тым ліку і беларускіх губерняў. За ваенныя гады большасць насельніцтва пазбавілася патрыярхальнай веры ў бязгрэшнасць учынкаў «бацюшкі-цара», усё менш было жадаючых змагацца за веру, цара і Айчыну. Крытычны настрой у арміі і грамадстве садзейнічаў шырокаму распаўсюджванню антываенных настрояў, якія пасля лютага 1917 г. хутка трансфармаваліся ў рэвалюцыйныя і прывялі да радыкальных перамен у сацыякультурным жыцці краіны.

---

1. *Бабков, А. М.* Беженское движение в Беларуси в годы Первой мировой войны / А. М. Бабков // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (Новыя канцэпцыі і падыходы) : матэрыялы Усебеларус. канф. гісторыкаў, Мінск, 3–5 лют. 1993 г. – Мінск, 1993. – Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. – С. 147–149.

2. *Бабков, А. М.* Политика германского империализма в Белоруссии в годы Первой мировой войны : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.03 / А. М. Бабков ; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1983. – 20 с.

3. *Белявина, В. Н.* Беларусь в годы Первой мировой войны / В. Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 398 с.

4. *Брусилов, А. А.* Мои воспоминания / А. А. Брусилов. – М. : Харвест, 2002. – 432 с.

5. *Войнилович, Э.* Воспоминания / Э. Войнилович ; пер. с пол., ред. В. Завальнюка. – Минск : Издание римо-католич. парафии св. Симона и св. Елены, 2007. – 380 с.

6. *Зябко, А. А.* Антываенны рух на тэрыторыі Беларусі (ліпень 1914 – люты 1917 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Зябко ; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск, 2013. – 23 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Малышев, Г. Н.* Нарочанское эхо Вердена / Г. Н. Малышев // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны : навук.-практ. канф., Смаргонь, 18–19 мая 2007 г. – Мінск, 2009. – С. 332–337.

8. Об охране и эвакуации // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 589. – Воп. 3. – Спр. 60.

9. Памяць : гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Брэст : у 2 кн. / уклад. А. П. Кондак ; редкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 1997. – Кн. 1. – 575 с.

10. Памяць : гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Карэліцкі раён / рэдкал.: В. К. Кунашка [і інш.]. – Мінск : Ураджай, 2000. – 645 с.

11. Памяць : гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Лунінецкі раён / уклад. Т. В. Канапацкая ; рэдкал.: Э. Н. Гнеўка [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – 716 с.

12. Памяць : гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск : у 5 кн. / уклад. А. А. Ляўшэвіч ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – Кн. 1. – 704 с.

13. Памяць : гіст.-дакум. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. Пінск / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад.: В. М. Курсаў, С. Ф. Шапіра. – Мінск : БЕЛТА, 1998. – 557 с.

14. *Сакалоўскі, У.* Беларускае адраджэнне і далучэнне нямецкіх вучоных да даследавання беларускай культуры / У. Сакалоўскі // Кантакты і дыялогі : інфарм.-аналітычны і культуралагічны бюлетэнь. – 1996. – № 3. – С. 9–17.

15. «Счастье мое…»: Дневники Иосифа Голубева, 1916–1923 гг. / сост. А. А. Клышко. – Минск : Энциклопедикс, 2002. – 448 с.

16. *Уварова, П. С.* Былое. Давно прошедшие счастливые дни / П. С. Уварова ; под. ред. Л. Заковоротной ; науч. ред. М. Бастракова. – М. : Изд-во им. Сабашниковых, 2005. – 296 с.

17. *Хаданёнак, В.* Цяжкасці пры правядзенні мабілізацыі на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны (1914–1918 гг.) / В. Хаданёнак // Беларускі гіст. часопіс. – 2013. – № 8. – С. 30–35.

18. Хрестоматия по истории Беларуси. С древнейших времен до 1917 г. / сост.: А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов. – Минск : Изд-во БГУ, 1977. – 497 с.

19. *Цуба, М.* Партызанскі рух на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны / М. Цуба // Беларускі гіст. часопіс. – 2010. – № 8. – С. 9–12.

20. *Chiari, B.* Geschichte als Gewalttat. Weißrussland als Kind zweiter Welkriege / Bernnard Chiari // Трагічнае лета 1941: напамін гісторыі : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 22 чэрв. 2001 г. : у 2 ч. / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Мін. дзярж. лінгв. ун-т. – Мінск : МДЛУ, 2001. – Ч. 1. – С. 128–143.

*M. BYASPALAYA*

**THE FIRST WORLD WAR IS A FATEFUL EVENT FOR BELARUS**

*Through the relationship of various segments of the population in the Belarusian province to the events of World War I, the article discusses its main points such as the mobilization, the main fights on the territory of Belarus, the tragedy of the refugees, the rise of anti-war movement, the occupation policy and etc.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 13.10.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ